CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

| WYPEŁNIA ZDAJĄCY | | |
|---|---|---|
| KOD | PESEL | *miejsce na naklejkę* |
| | | |

# PRÓBNY EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM PODSTAWOWY

DATA: **kwiecień 2020 r.**

CZAS PRACY: **170 minut**

LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **50**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 13 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.

MOB-P1_**1**P

NOWA FORMUŁA

Układ graficzny
© CKE 2015

**Przeczytaj tekst i wykonaj zadania 1.–4.**

Надзея Дзямідка

***Як авалодаць мовай з нуля: слушныя парады ад выкладчыц філфаку БДУ***

Як хацелася б, каб можна было націснуць на якую-небудзь цудадзейную кнопачку і – вуаля! – замежная мова ўжо месціцца ў скарбонцы тваёй падсвядомасці. На жаль, усё не так проста. Знаёмцеся: выкладчыцы філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта – Ірына Пятроўна Арбуз і Наталля Канстанцінаўна Крэпская. Гэтым разам яны распавядуць, як эфектыўна вывучаць мовы.

– Падзяліцеся, калі ласка, з чаго пачынаць вывучэнне замежнай мовы?

Ірына Пятроўна: Мяркую, з дакладнага абазначэння мэты вывучэння мовы. Не мае значэння, якую вы плануеце вывучаць – ангельскую, нямецкую, фінскую ці іўрыт. Першыя пытанні, якое вы мусіце сабе паставіць: навошта я гэта вучу, як мне яно спатрэбіцца ў будучыні? Разуменне мэты – гэта не што іншае, як матывацыя, а яна складае ільвіную долю поспеху ў авалоданні любой справай. Па-другое, мэта дыктуе сродкі яе дасягнення.

– Так, я цалкам згодна з Ірынай Пятроўнай. Натуральна, калі вы, напрыклад, збіраецеся вандраваць, то маеце права самі нарміраваць, фармаваць сваё валоданне замежнай мовай. Магчыма, вы не збіраецеся весці філасофскія дыскусіі з іншаземцамі, вам дастаткова ведання простых камунікацыйных сітуацый і фраз накшталт „прывітанне”, „як справы?”, „як прайсці да вакзала?”, „колькі гэта каштуе” і г.д. У такім выпадку вы можаце набыць размоўнік і пры наяўнасці часу да паездкі паспрабаваць авалодаць гэтым лексіконам. Ну, а што не паспееце вывучыць загадзя, будзеце спасцігаць на месцы, так бы мовіць, метадам спроб і памылак. Іншая справа, калі мова патрэбна вам для вучобы альбо працы за мяжой. Тут ужо не абыдзешся простымі „хэло” і „хау а ю”, прыдзецца інтэнсіўна папрацаваць.

– Наконт матывацыі зразумела. Які наступны крок, каб спазнаць моўныя таямніцы?

Ірына Пятроўна: На мой погляд, гэта выбар правільных дапаможных сродкаў. Важна, каб абраныя вамі вучэбныя метады пакрывалі трэніроўку ўсіх моўных кампетэнцый – пісьма, вуснага маўлення, разумення, чытання, граматыкі, лексікі, вымаўлення. Сучасны падручнік, які б падаваў існуючыя нормы граматыкі мовы і рэальныя камунікацыйныя сітуацыі, не адарваныя ад культурнага кантэксту краіны. Эфектыўна будзе таксама зарэгістравацца на якім-небудзь сайце, дзе можна паразмаўляць альбо паперапісвацца з носьбітам мовы. Вы павінны атачыць сябе іншамоўнай атмасферай – напрыклад, пачынаць свой дзень з праслухоўвання замежнага радыё альбо прагляду навін. Відавочна, спачатку вы будзеце разумець толькі мінімум з пачутага, але ваш мозг будзе прывыкаць да ўспрымання інфармацыі на незнаёмай мове, і з кожным праслухоўваннем вы будзеце адчуваць сябе ўсё больш і больш упэўнена.

Паводле http://adukacyja.info

**Заданне 1. (0–1)**

**На аснове тэксту ацані праўдзівасць сказаў, змешчаных у табліцы. Калі сказ праўдзівы, пазнач П, калі фальшывы – Ф.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Не абавязкова звяртацца да культурных кантэкстаў краіны, каб дасканала авалодаць іншай мовай | **П** | **Ф** |
| **2.** | Каб паспяхова вывучыць замежную мову, варта ведаць нашто яна нам патрэбна. | **П** | **Ф** |
| **3.** | Час, самастойная праца, шмат намаганняў і сістэматычнасць неабходны для хуткага авалодання мовы. | **П** | **Ф** |

**Заданне 2. (0–2)**

**а) Закончы сказ. Выберы правільны адказ сярод прапанаваных варыянтаў А.–Г.**

*Ільвіная доля* – гэта

**А.** жаргонныя словы.

**Б.** памяншальна-ласкальная форма.

**В**. фразеалагізм.

**Г**. заалагічны тэрмін.

**б) Растлумач значэнне словазлучэння *ільвіная доля*.**

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

**Заданне 3. (0–1)**

**Падбяры сінонімы да пададзеных ніжэй слоў.**

мэта – ..................................................................................................................................

іншаземец – …......................................................................................................................

паездка – …..........................................................................................................................

**Заданне 4. (0–1)**

**У трэцім абзацы знайдзі словы, якія адпавядаюць значэнням:**

1. дапаможнік для вывучэння замежнай мовы, які змяшчае ўзоры гутаркі на розныя бытавыя тэмы – ...................................................................................................................

2. зараней, наперад – ............................................................................................................

3. пісьмовае пасведчанне аб чым-небудзь – ........................................................................

**Przeczytaj tekst i wykonaj zadania 5.–9.**

Таццяна Арлова
***Ідэалы і вобразы***

У любым даведніку тэатральнае мастацтва вызначаецца як форма грамадскай свядомасці, як пункт гледжання на падзею, выяўлены з дапамогай сцэнічнага дзеяння.

У агульным працэсе развіцця сучаснага тэатра ідуць бесперапынныя пошукі новых форм і магчымасцей іх увасаблення ў аўтарскай практыцы.

Любое пакаленне звычайна інтэрпрэтуе новае праз вядомую яму мову. Гэта асабліва важна для беларускага мастацтва з традыцыйным прыматам зместу. Дастаткова доўга на тэрыторыі Беларусі ягонымі асноўнымі крыніцамі з’яўляюцца традыцыі народнай фальклорнай культуры, а сёння і шырока распаўсюджаны шоу-бізнес. У гэтай сферы мова цалкам зразумелая і засвоеная з дзяцінства. Яе не трэба перакладаць на мову сімвалаў і знакаў.

У гэтым сэнсе па-свойму трагічны лёс спектакляў Віталя Баркоўскага. Ён абапіраецца на нацыянальныя архетыпы, але паслядоўна сцвярджае на сцэне свой канцэптуальны[1] стыль. Элітарная форма ягоных спектакляў стварае цяжкасці разумення нават для неардынарнага гледача, нават для тэатразнаўцаў і прадстаўнікоў медыйнага асяродка – такая ўжо доля ўсіх эксперыментатараў. Ён імкнецца эстэтызаваць хаос і перавесці ў пластыку думкі пра адзіноту духу, які не здатны выявіць сябе. Ён шукае інтымнасць у публічнасці і каханне ў адсутнасці кахання.

Баркоўскі, хутчэй за ўсё інтуітыўна, засвоіў галоўны пастулат постмадэрнісцкага мастацтва – абсалютнай ісціны не існуе, пошук яе – марная трата часу. Усё ўмоўна, усё адносна, усё – гульня ўяўлення. Адсюль свабоднае перакідванне герояў у прасторы і часе, але ў межах нацыянальнага менталітэту. Героі ягоных спектакляў – беларусы, нават калі гэта і не мелася на ўвазе ў п’есе.

Словы існуюць у прасторы сцэны, персанажы дапасоўваюць іх да сябе. Спачатку словы пазбаўляюцца сэнсу, адрываюцца ад пачуццяў і сітуацый, якія іх нарадзілі. Слова набывае ўніверсальнае значэнне, робіцца нібыта магічнай формулай. Героі далучаюцца да змешчанага ў іх перажывання. Па сутнасці, гэта новы спосаб камунікацыі, калі дзейныя асобы звяртаюцца не проста адзін да аднаго, як у псіхалагічным тэатры, а – праз адчужаныя словы, цераз прастору і прадметы. У гэтым прысутнічае недагаворанасць, недаказанасць, каштоўная бясконцая перспектыва.

Паводле http://www.kimpress.by

[1] Ад канцэпцыя – сістэма поглядаў, спосаб разумення якіх-небудзь з'яў. // Асноўная думка, агульная задума твора.

**Заданне 5. (0–1)**
**Ці на кожнае пытанне ў табліцы можна знайсці адказ у тэксце? Падкрэслі ТАК калі гэта магчыма, НЕ – калі немагчыма.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Які падыход існуе сёння да тэатральнага мастацтва? | **ТАК** | **НЕ** |
| **2.** | Якія тэатральныя калектывы цешацца найбольшай папулярнасцю сярод беларускіх гледачоў? | **ТАК** | **НЕ** |
| **3.** | Якую ролю адыгрывае традыцыйны фальклор у развіцці тэатральнай культуры? | **ТАК** | **НЕ** |

**Заданне 6 (0–2)**
**а) Выберы правільны адказ сярод прапанаваных варыянтаў А.–Г. У якім стылі напісаны тэкст Таццяны Арловай *Ідэалы і вобразы*?**

**А.** навуковым

**Б.** афіцыйна-дзелавым

**В.** публіцыстычным

**Г.** мастацкім

**б) Падай дзве характарыстычныя асаблівасці гэтага стылю.**

1. ........................................................................................................................................

2. ........................................................................................................................................

**Заданне 7. (0–1)**
**Адшукай у тэксце словы іншамоўнага паходжання, якія адпавядаюць значэнням:**

1. Зыходнае палажэнне, якое прымаецца без доказу (5 абзац) – ..........................................

2. Перавага, найважнейшае значэнне (3 абзац) –..................................................................

3. Беспарадак (4 абзац) – .....................................................................................................

4. Першавобраз, арыгінал, першаўзор (4 абзац) – ...............................................................

**Заданне 8. (0–1)**
**Карыстаючыся трэцім абзацам выясні як разумееш сэнс сказа: *Любое пакаленне звычайна інтэрпрэтуе новае праз вядомую яму мову.***

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

..........................................................................................................................................

**Заданне 9. (0–3)**

**Напішы рэзюмэ да тэксту памерам 40–60 слоў.**

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

**Заданне 10. (0–37)**

**Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie.**

**Тэма 1. Ці гатовы сучасны чалавек прысвяціць сябе іншым? Паразважай над праблемай на аснове фрагмента твора Янкі Брыля *Memento mori* і іншых тэкстаў культуры. Твая праца павінна налічваць не менш за 250 слоў.**

Янка Брыль
***Memento mori***
(скарочана)

Позняй восенню сорак трэцяга года на адным з самых спакойных перагонаў Беларускай чыгункі ўзарваўся нямецкі вайсковы эшалон.

Праз дзень, халодным, золкім досвіткам, бліжэйшую да месца катастрофы вёску акружылі карнікі. […] Як высветлілася значна пазней, уцалела толькі двое: хлапчук, які выпаўз баразной у загуменныя кусты, і дзед, што якраз заначаваў у сваяка на дальнім хутары.

Усе іншыя жыхары сагнаны былі ў той канец вёскі, дзе стаяла старая вялізная адрына, – усё, што ўцалела ад калгаснай фермы.

Зондэрфюрэр, начальнік экспедыцыі, разважыў, што прымусіць «бандытаў» капаць сабе яму – доўгая гісторыя. Значна прасцей спаліць іх у гэтай адрыне. […]

Побач з ім амаль непрыкметна ўздрыгвала ад пранізлівай слаты маладая збялелая перакладчыца.

– Мы хутка скончым гэтае швайнэрай[2], і тады, фройляйн Вэра, паедзем дахаты. Будзе зноў цёпла... О так!..

Істота ў скураным паліто і белай вязанай хустцы выклікала на твар крывое падабенства службова-інтымнай усмешкі.

Так бы ўсё і было, як бывала, аднак, […] зондэрфюрэр заўважыў знаёмага.

– Адкуль я ведаю яго?.. О! Мэншэнскінд[3], дык гэта ж той пячнік! Скажыце, фройляйн Вэра, каб яго падагналі сюды.

Печніка падагналі.

– Біст ду дох аўх гір, майн лібэр кэрль?[4] – засмяяўся начальнік.

---

[2] Швайнэрай – свінства.
[3] Даслоўна – «дзіця чалавечае», адпавядае беларускаму «хлопча».
[4] *І ты таксама тут, мой дарагі?*

Пячнік нічога не зразумеў. Ды, відаць, і не чуў. Бледны, без шапкі на лысіне, абраслы сівеючай шчэццю, ён упёрся ў немца скамянелымі вачыма і маўчаў. Толькі бяскроўныя губы перасмыкаліся, як ад нязбытнага жадання гаварыць.

Улетку ён рабіў зондэрфюрэру печы. Знайшлі яго і прывялі, вядомага на ўсю ваколіцу. Пяць раніц дзяжурны жандар абшукваў яго і кожны раз аднолькава весела знаходзіў у кішэнях майстра тое самае крэсіва, самасад і кавалак чорнага хлеба. А печы атрымаліся выдатныя. Кухар хваліць пліту, а сам зондэрфюрэр – грубку з белай кафлі. Вось і цяпер ён ледзь не заахкаў на ўспамін аб яе гладкай цеплыні.

– Скажыце яму, фройляйн Вэра, што ён не будзе спалены. Спытайцеся, ён хоча жыць?

– Спадар зондэрфюрэр кажа, што вы, дзядзька, будзеце жыць. І ён пытаецца, ці вы гэтага хочаце?

Пячнік толькі паварушыў бяскроўнымі губамі.

–І скажыце яму... Спытайцеся, хто ў яго там ёсць.

– Спадар зондэрфюрэр пытаецца, хто ў вас там ёсць? Там – у адрыне?

З вуснаў у чалавека сарваліся словы:

–Там... мая... баба...

– Ён кажа, што там яго жонка.

– Скажыце яму, што жонка яго таксама не згарыць. Ён можа ўзяць яе.

– Спадар зондэрфюрэр кажа, што фраў... што жонку сваю вы можаце забраць.

Бяскроўныя губы ў сівеючай шчэці заварушыліся зноў:

– У мяне там і дачка... з малымі дзет... камі...

– Ён кажа, што там у яго ёсць дачка са сваімі дзецьмі.

– О! Мэншэнскінд! Можа, у яго яшчэ хто-небудзь ёсць?

– Спадар зондэрфюрэр пачынае выказваць нездавальненне. Ён пытаецца, хто ў вас там ёсць яшчэ?

– Скажы яму, што ў мяне там суседзі... А ты скажы, што яны сваякі...

– Ён кажа, што ў яго там многа сваякоў. А таксама суседзі.

– Суседзі?! Эс іст абэр этвас цу ляхен!..[5] Можа, ён хоча, каб я аддаў яму ўсю гэтую банду? Спытайцеся ў яго апошні раз: чаго ён хоча, вар'ят?

– Спадар зондэрфюрэр пачынае злаваць. Вы, дзядзька, не дурыцеся, калі хочаце жыць. Зараз адрыну падпаляць. Ён кажа, што вы, мусіць, хацелі б забраць адтуль усю банду.

Пад чорнай навіссю броваў ажылі нарэшце вочы. Губы зусім перасталі дрыжаць. Нібыта не сваю, незвычайным жэстам, пячнік узняў галаву:

– А ён што думаў? І ўсіх! Усіх добрых людзей!.. Можа, ён ім раўня – гэты твой гаспадар? Або ты, можа? Цьфу!

Чалавек плюнуў пад ногі, тады павярнуўся і ўжо не тым няпэўным крокам, як сюды, пайшоў да варот адрыны.

Быў нейкі момант разгубленасці, а потым зондэрфюрэр сарваў з правай рукі мокрую скураную пальчатку, адшпіліў кабуру, выхапіў пісталет і прыцэліўся...

У жудасным ляманце стрэл амаль не пачуўся.

Але пячнік упаў.

Ён яшчэ ўздрыгваў, калі яго паднялі і кінулі цераз парог, пад ногі збою аднавяскоўцаў.

Тады вароты назаўсёды зачыніліся.

І ён згарэў – адзін, хто мог бы ў той дзень не згарэць.

І ён жыве.

---

[5] *Гэта ўжо проста смешна!..*

**Тэма 2. Зрабі аналіз верша. Пастаў інтэрпрэтацыйны тэзіс і абгрунтуй яго. Твая праца павінна налічваць не менш за 250 слоў.**

Максім Танк
***Рукі маці***

Іх цалавала зямля
Сваімі пясчанымі вуснамі
І каласамі;
Неба спякотай, вятрамі, дажджамі
Іх цалавала.

Пража нямала
З іх выпіла ў ночы бяссонныя
Свежасці ранняй.
Колькі яны запалілі світанняў,
Зораў над намі.

Колькі сягоння на іх
Віднеецца чорных, глыбокіх
Шрамоў і маршчынаў,
Гэта сляды, што навекі пакінуў
Шлях наш суровы.

Толькі заўсёды,
Як мы зберымося дамоў
І на стол пакладзе рукі маці,
Быццам ад сонца, ад іх пасвятлее ў хаце
І ў сэрцы.

[1951]

http://maksimtank.ru

# WYPRACOWANIE

**na temat nr....................**

**Tabelę wypełnia egzaminator!**

| | | Liczba punktów | Suma | Uzasadnienie przyznania 0 punktów |
|---|---|---|---|---|
| rozprawka | A. | 0 – 3 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 6 – 9 – 12 | | |
| interpretacja | A. | 0 – 2 – 4 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 8 – 12 | | |
| | C. | 0 – 1 – 2 | | |
| | D. | 0 – 2 – 4 | | |
| | E. | 0 – 1 – 2 | | |
| | F. | 0 – 1 – 3 | | |
| | G. | 0 – 2 – 4 | | |
| | H. | 0 – 2 – 4 | | |

**BRUDNOPIS** ***(nie podlega ocenie)***